АСТРАМЕЧАЎСКІ РУКАПІС

БРЭСЦКІ РАЁННЫ КРАЯЗНАЎЧЫ АЛЬМАНАХ

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЛІТАРАТУРНАЕ ВЫДАННЕ

БРЭСЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

АДДЗЕЛ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ РАЙВЫКАНКАМА

БРЭСЦКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ (ГРАМАДСКІ ФУНДАТАР)

БРЭСЦКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕЦЬ

Кантакты:

(+375 29) 20-161-02;

e-mail: kotlas@tut.by

Чытаць анлайн: http://brest-railib.by

16+

Падпісана да друку 16.09.2019.
Фармат 70х100 1/16. Гарнітура PF Agora Serif Pro.
Тыраж 99 экз. Ум. друк. арк. 8,10.
Друк цыфравы. Надрукавана ТДА «Артлайнсіці»,
г. Брэст, вул. Карбышава, 74.
Арыгінал-макет падрыхтаваны
ТАА «Паліграфіка», зак. 304-2019.
Пасв. 2/2 ад 16.08.2013, пасв. 1/22 ад 16.08.2013,
вул. Кірава, 122, пам. 85, 224013, г. Брэст
тэл. (+375 162) 35-55-67, www.poligrafika.by

1-я с. вокладкі: "Пейзаж" Коноваленко Андрей

1-я і 4-я с. вокладкі: святочны арнамент

Выходзіць штоквартальна
Мова: беларуская, руская

№ 4 [28]•2019

У НУМАРЫ



Напутствие Президента Беларуси



Празднование тысячелетия Бреста началось в полдень, когда на главной площади города торжества открыл Президент Республики Беларусь Александр Лукашенко. Поздравления Александра Григорьевича, Брестская Библия, преподнесенная им в качестве подарка городу-юбиляру, выступление артистов и коллективов — старт мероприятий миллениума получился насыщенным.

Ближе к вечеру брестчане и гости города в отличном настроении снова заполнили улицы областного центра.

Международный парад оркестров стран СНГ «Марш тысячелетия» начался около памятника тысячелетию Бреста. Оркестровые коллективы из России и Казахстана исполняли и мелодии из кинофильмов, и народные, и аккомпанировали вокалистам. Зрители оценили душевность атмосферы бурными аплодисментами после каждого выступления.







А уже через час нужно было спешить на другую площадку — на площади Ленина начиналось юбилейное десятое музыкальное шоу «Город света». Света действительно было много: как только на улице стемнело и стало прохладно, зажглись фонари и фонарики, а на танцполе было по-настоящему жарко.

Для собравшейся аудитории зажигали известные исполнители и музыканты: группа «Nuteki», Исайя, JesseCampbell и легендарный Джо Тёрнер.

Также в концерте приняли участие брестские вокалисты и танцоры, такие как Вовка Плюмбум, детский танцевальный коллектив «Ровесники», финалисты престижного мирового первенства World of Dance команда «MonsterKids». Разогрел публику DJ Peretse из Москвы — лучший спидмиксер и мегамикс-мейкер России.

В пятничный вечер на центральной площади исполнялось все: от рэпа до рока. Артисты были не похожи друг на друга. И это по-настоящему круто.







«Наследие святое»

Под таким названием в рамках празднования юбилея областного центра на площадке у храма святителя Николая Чудотворца состоялся концерт духовной музыки, в котором приняли участие хоровые коллективы православных храмов Брестской епархии.

Предварил выступление хоров благодарственный молебен в память о 1000-летнем юбилее города, который возглавил Его Высокопреосвященство, Высокопреосвященнейший Иоанн, архиепископ Брестский и Кобринский.

Услышать богослужебные песнопения в обработке знаменитых композиторов XIX — XX столетий пришла многочисленная зрительская аудитория.

Затем состоялся концерт духовных песнопений хоровых коллективов городских храмов Брестской епархии «Наследие святое». В нем приняли участие хор духовенства епархии, большой хор собора Воскресения Христова, детско-юношеский хор кафедрального собора преподобного Симеона Столпника «Благовест», хор храма иконы Божией Матери «Всех скорбящих Радость».



На гребном — «Миллениум»

В субботний теплый вечер тысячи людей собрались на Гребном канале, чтобы посмотреть на главное шоу тысячелетнего Бреста — двухчасовую музыкально-историческую композицию «Миллениум».

Торжественное действо развернулось на огромной сцене высотой с пятиэтажный дом. Она стала значимой составляющей творческой программы. Выступления исполнителей, участников театрализованных постановок дополнялись яркими кадрами на семи экранах различных форм и размеров. Был и восьмой — водный экран. В шоу задействовали сооруженный перед сценой бассейн с фонтанами, работавший в различных режимах. Дополняла эту водную красоту красочная подсветка.

Огнем, водой и светом авторы постановки рассказали зрителям многовековую историю города: начиная от первого упоминания в «Повести временных лет» до нынешних времен. Вся программа «Миллениума» прославляла древний и величественный Брест, рассказывала о его становлении и представляла собой ожившие страницы истории. Например, зрители увидели театрализованные постановки передачи Магдебургского права, создание Брестской Унии, издательство Брестской Библии, строительство железнодорожного вокзала и т.д. Во время исполнения сцен, связанных с Великой Отечественной войной, участники и зрители почтили минутой молчания всех погибших в тех баталиях. Дальше программу продолжили концертные номера, посвященные развитию города уже под мирным небом.

В общей сложности в шоу участвовало более тысячи артистов: гимнасты, актеры, ходулисты, танцоры. Среди них были Тео, Инна Афанасьева, Алена Ланская, Иван Бабищевич, Naviband и другие. Был на сцене и Эдуард Ханок, который специально к миллениуму написал и исполнил душевную песню о Бресте. Режиссером-постановщиком выступила Анжелина Микульская, а музыку написал композитор Леонид Ширин.

Ключевым моментом шоу стала клятва, которую от лица всех брестчан зачитал почетный гражданин города художник-ювелир Николай Кузьмич.

После чего зазвучал гимн городу «Славься, Брест», с последними аккордами которого в небо над Мухавцем взмыли залпы фейерверка. Более десяти минут тысячи гостей и жителей города могли наблюдать прекрасные россыпи разноцветных огней.

Забег в честь тысячелетия

Пока многие жители и гости областного центра просыпались после насыщенной на мероприятия субботы, недалеко от Гребного канала готовились к своим стартам 700 бегунов разных возрастов.

В брестском полумарафоне, который прошел 8 сентября, приняло участие более 700 бегунов. Во втором брестском полумарафоне любители бега соревновались на трех дистанциях: 6, 10 и 21 км.

Когда бегуны на всех дистанциях финишировали, на площадке у Гребного канала начался концерт.

Завершился спортивный праздник семейным забегом для детей от 4 до 16 лет и их родителей. Все участники мероприятия получили памятные медали и сувениры от организаторов.



Василюк не уходит из футбола

Одним из ярких событий праздничной субботы стал прощальный матч легендарного форварда брестского «Динамо» Романа Василюка против польской «Ягеллонии».

В противостоянии белостокской дружине брестчане уступили со счетом 1:2. «Динамовцы» вели в счете до 88-й минуты после гола Алексея Хобленко, однако в концовке во время контратаки пропустили два гола от Хесуса Имаса.

Роман Василюк вышел на поле в стартовом составе. Отыграв первый тайм, «легенда» под овацию болельщиков уступил место Артему Милевскому.

На послематчевой конференции главный герой вечера заявил:

— Я ушел из игры, но не из футбола.

Встречу на ОСК «Брестский» посетил 5521 зритель.



«Белая вежа» — школа мастерства



Прошел XXIV Международный театральный фестиваль «Белая вежа».

Представителей тринадцати стран-участниц фестиваля — 28 театральных коллективов из Беларуси, России, Украины, Молдовы, Польши, Германии, Франции, Казахстана, Армении, Болгарии, Венгрии, Грузии, Литвы — тепло приветствовали собравшиеся в большом зале БАДТ.

Министр культуры Юрий Бондарь направил участникам и гостям фестиваля приветствие, которое зачитала представитель министерства Елизавета Гринкевич.

— Благодаря фестивалю жители и гости города над Бугом имеют уникальную возможность познакомиться с классическими и новаторскими постановками из разных стран. Для деятелей театра «Белая вежа» является настоящей школой мастерства, площадкой для обмена опытом, интересных дискуссий и знакомств, — отметил Юрий Бондарь.

Программу международного фестиваля открыл спектакль «Сымон-музыка» в постановке Национального академического драматического театра имени Я. Коласа.



После чего свое мастерство под открытым небом на площади Ленина продемонстрировал обладатель Гран-при «Белой вежи» Львовский академический театр «Воскресиння». Любимцы местной публики показали огненно-пиротехнический, основанный на легендах, уличный спектакль «Карпатский калейдоскоп». Режиссер Ярослав Федоришин, используя символы огня и воды, поставил зрелищно-философское действо.



На набережной — «Любовь есть»!

Яркой точкой в праздновании миллениума областного центра стал семейный фестиваль «Любовь есть» на городской набережной.



Открыли мероприятие известный телеведущий Евгений Булка и финалистка детского Евровидения София Рустамова. После их приветственных слов зажигать на сцену выходили студия танца «Альянс», творческий центр ArtPipper и вокальная студия «Магалифф».

Во время небольшого перерыва был торжественно открыт еще один арт-объект «Сердце Бреста», который, с уверенностью можно сказать, станет популярным местом для фотографирования у жителей и гостей города над Бугом.



А дальше праздник продолжился. Набережная превратилась и в парк аттракционов, и в фуд-корт, и в мастерскую, и даже в поле боя. Оружие, правда, было лазерное, а вот баталии — самые настоящие. Чуть дальше расположились палатки-мастерские. В каждой обучали определенному ремеслу. В первой — лепить из глины, во второй — вырезать из дерева, в третьей — обучали ткацкому искусству, а именно — делать кукол, в четвертой делали пряники.



Работали на набережной и фотозоны, которые ни на минуту не оставались пустыми, и аттракционы для детей, и палатки с мороженым. Самой большой очередью в этот день могла похвастаться «Мастерская Будулая», где совершенно бесплатно кузнец выбивал монетку с чеканкой логотипа тысячелетия Бреста.

Любой желающий, взяв открытку, мог оставить произвольное по форме и содержанию послание-поздравление любимому городу.

Ну а вечером начался гала-концерт. Яна Буцкевич, Влада Филипова, Елена Надольская, Игорь Пашечко, Герман Титов заводили публику перед выступлением хедлайнеров фестиваля популярной группы «Время и стекло». Послушать украинских артистов собрались тысячи брестчан и гостей города. И никто не ушел разочарованным, ведь Леша и Надя по-настоящему зажгли. Их бронебойные хиты «Имя 505», «Наверно-потомучто», «Е, бой», «Vislovo» и т.д. раскачали публику по максимуму. Народ танцевал и подпевал. Каждая песня была встречена бурными эмоциями и овациями.

Под звон мечей и пушек гром

На открытой площадке археологического музея «Берестье» прошел исторический фестиваль «Город Древний», посвященный 1000-летию Бреста.

Под все еще жарким сентябрьским солнцем члены брестского клуба реконструкторов «Рубеж» развернули целый ряд интерактивных площадок. Гости мероприятия могли примерить рыцарские доспехи XV столетия, выполнить пару несложных приемов с мечом или сфотографироваться с настоящим викингом.





Особый интерес у зрителей вызывала площадка, посвященная бурному XVII веку. Здесь облаченные в костюмы шляхтичей и обмундирование воинов той далекой эпохи реконструкторы охотно общались со всеми желающими, отвечая порой на самые различные вопросы.

Брестчане и их гости узнали много нового об истории родного города, погрузились в реалии далеких времен и смогли в непринужденной обстановке поговорить с профессионалами своего дела.

Павел БОГУШ
Антон ПОПОВ

Прыбужжа святочнае



Адной з праграм мерапрыемстваў, прысвечаных 1000-годдзю горада Брэста, было свята-конкурс фальклорнага мастацтва «Таночак». У ім прынялі ўдзел дзіцячыя і маладзёжныя фальклорныя калектывы, выканаўцы твораў розных відаў народнага традыцыйнага мастацтва, якія вывучаюць і папулярызуюць аўтэнтычную мастацкую культуру Брэсцкай вобласці. Дзіцячы калектыў Страдзецкага СДК «Канфеці» разам з іх кіраўніком Веранікай Хвісючык прадставілі праграму з песнямі і танцамі ў адпаведнасці традыцыям і звычаям сваёй мясцовасці. У намінацыі «Вусная народная творчасць» Дацык Уладзіслаў, удзельнік калектыву Прыбараўскага народнага хора імя Г.А. Хлебцэвіча, атрымаўдыплом III ступені. Удзельніца гуртка Дома рамёстваў Сафія Машлякевіч атрымала дыплом і памятныя падарункі за захаванне традыцый і рамяства.



Пад час свята у дэфіле-паказе «Модны стыль — народны тэкстыль» у межах этнапраекта «Рух зямлі» адбыўся паказ самабытных народных строяў. Брэсцкі раён прадэманстраваў касцюм Дамачаўскага строю.


У рамках заключнага мерапрыемства абласнога агляда-конкурса вядучых гульнявых праграм «Берасцейскія забаўлянкі», дыпломам I ступені ў намінацыі за «Зберажэнне мясцовых гульнявых традыцый» узнагароджаны Надзея Брашчук і Ульяна Апановіч.

Творчыя калектывы Прыбужжа з годнасцю паказалі высокі ўзровень выканальніцкага майстэрства ў захаванні мясцовай традыцыйнай культуры.

Алена ПАДДУБНАЯ,
метадыст РМЦ







АСТРАМЕЧАВА І АСТРАМЕЧАЎЦЫ

В Остромечево стартовала акция ГАИ и велоклубов Бреста «Сохрани себе жизнь!»

На центральной площади агрогородка Остороmечево сегодня, 25 октября, в 12:00 часов стартовала крупномасштабная акция Госавтоинспекции области и велоклубов Бреста — «Сохрани себе жизнь!».



Мероприятие направлено на предупреждение дорожно-транспортных происшествий с участием велосипедистов и возчиков гужевого транспорта.

На центральной площади организован сбор велосипедистов и возчиков гужевого транспорта, проживающих в Брестском районе. Сотрудники Госавтоинспекции совместно с представителями велоклубов проводили профилактические беседы с велосипедистами, обозначали световозвращателями и све-





товозвращающей пленкой велосипеды и гужевые повозки.

В завершении мероприятия участникам акции подарили жилеты повышенной видимости.

Проведение аналогичных мероприятий будут продолжены на базе Сельских Советов области.


ГАИ УВД

Какой быть «эковёске»?

В Доме культуры агрогородка Остромечево состоялась презентация градостроительного проекта «Генеральный план аг. Остромечево Брестского района».

Он будет определять стратегию социально-экономического и территориального развития планировочной структуры и функционального зонирования качества окружающей среды, эволюцию системы общественного обслуживания, транспортной и инженерной инфраструктур, направленную на создание современного сельского населенного пункта с городским комфортом проживания.

На встречу с местными жителями прибыли глава района Владимир Сенчук, его заместители Илья Бандровский, Николай Коршенков, председатель Лыщицкого сельисполкома Инна Дячек, представители профильных районных служб.








Разработку проектной документации осуществляет УП «Белниипградостроительства». Общее видение «эковёски» представил главный архитектор проекта Алексей Ислямов. Созданный столичными специалистами план предусматривает формирование целого экокластера с объединением в единый комплекс соседних населенных пунктов.

Главная цель проекта — укрепить деревню, обеспечить аграрный сектор квалифицированными кадрами, остановить отток населения в город — все это возможно только с повышением качества жизни в сельских населенных пунктах. Будущая экодеревня должна стать образцом комфорта загородной жизни, где людям доступны все социальные блага, не хуже городских — медицина и образование. Предоставится возможность заниматься спортом и, конечно, работать и достойно зарабатывать. А как бонус — собственный дом и приусадебный участок. По задумке, основными жителями здесь должны стать дети местных жителей. А потому, чтобы реализовать проект, в первую очередь необходимо максимальное привлечение к обсуждению местного населения.

Свои замечания и предложения можно направлять в письменном или электронном виде а с пометкой «Генеральный план аг. Остромечево Брестского района» по адресу: Брестский райисполком, 224030, г. Брест, ул. В. Хоружей, 2 или на адрес электронной почты: arh_brestrik@brest-region.by

Наталья ТОЛКАЧЕВА
Фото автора



Працяг. Пачатак у нумары №3, 2019)

Вясельная абрадавая паэзія Брэсцкага рэгіёна

Ад’езд маладой да маладога

Ад’езд маладой з бацкоўскай хаты — эмацыянальная кульмінацыя традыцыйнага вяселля, маладая і яе маці пралівалі нямала горкіх слёз у прадчуванні разлукі і ў трывозе за будучы лёс маладой жонкі. Гэты этап таксама быў насычаны адметнымі дзеяннямі.

Амаль паўсюдна быў звычай красці кур, якіх аднак, потым назад не вярталі. У весцы Ляплёўка родная і хросная маці маладой, перад тым як сесці на вазы, абвязвалі сябе “скрывальшчынай”. У гэтай жа вёсцы быў яшчэ адзін звычай: “Для молодэй готовять сумку со сніданнем. Всігда ж молодая прывозыла з собою сніданне. Прыежжають до жэніховой родні. і той сніданок сразу на стол”. *(Еўдакія Бондарава, 1934 г.н., в. Ляплёўка, Брэсцкі раен)*

Шолкова ныточка в стэну б’е,
Манючка матёнцы дякуе:
Дякую, матёнко, дякую,
Вжэ я з твоею хаты ўступаю.
Нэ уступаю на рік, на рік.
Ой, уступаю на всёй вік.
Тобі, матёнко, хата, комора, убора,
А мне, мулудый, скрыня,
пэрына й корова.
(в. Знаменка, Брэсцкі раен)

Гусы лытять, гусы лытять
Лісом — бором, гігаючы.
Сваты йідуть, сваты йідуть
Сэлом — бором, спэваючы.
Мэжы йімы, мэжы йімы
Молода Манючка смутно сэдыть,
Смутно сэдыть, смутно сэдыть,
Рівно плачэ, дрібнэсэнько.
Тішыть йіе, тішыть йіе
Молоды Ванечка, тішыть йіе:
Нэ плач, нэ плач, молода Манючка,
Мойго батэнько новый двір відно.
(в. Знаменка, Брэсцкі раен)

Прыезд маладой пары да маладога

Йіванкова матюнка
Цылу нічку нэ спала,
Цылу нічку нэ спала,
У воротах стояла.
У воротах стояла,
Свайго сына дожыдала,
Прыкладала головку
До зыленого шолку.
Чы шумыт дубровунька,
Чы звынит дорожэнька.
Чы ны йідэ муй сыночок,
Чы нэ візэ нэвісточку.
Чы нэ візэ нывісточку,
На муе полэ робітночку,
До муе хаты попрятночку,
Муе коморы заключнічку.
(в. Знаменка, Брэсцкі раен)

У Брэсцкім раене пасля сустрэчы маладых хлебам — соллю ў хату іх заводзіў дружко (тут ен таксама называецца сватам): ён трымаў у руцэ хустачку, за якую бралася маладая, а за ёю ўваходзіў малады.



Фота з угалка этнаграфіі Ляплёўскага СК

Сваццi — спявачкі з боку маладога працягвалі ў песнях “нападаць” на маладую:

Нэ ўспіла Манючка на двір в’іхаты,
Вышлы зованькі пэрыглядаты.
Пэрiглядывшы, пушлы дохаты,
Пушлы дохаты маты казаты:
Ой, мамо, мамо, дывна нывіста,
Дывна нівіста, нэуклоныста.
На двір в’іхала, нэ поклонылася,
Своім зованькам нэ покарылася.
(в. Знаменка, Брэсцкі раен)

У тых традыцыях, дзе прыданае нявесты везлі разам з ею, прыданкі дапамагалі маладой развешваць ручнікі, мяняць занавескі на вокнах, раскладваць абрусы — “за ноч (да маладога прыязджалі звычайна ўжо позна ўвечарыю) — памяняюць усю хату — ужэ хозяйка пойіхала”.
(Еўдакія Луцюк, 1932 г.н., в Ляплёўка, Брэсцкі раен)



Паказ вясельнага абрада “Сыра” аматарамі фальклора “Жывая вада” Ляплёўскага СК на абласным свяце фальклорнага мастацтва “Таночак”)

Пэрэзва

На другі (або трэці) дзень у дом маладога прыязджалі родныя маладой, каб “одведать свою невесту”.

Погнулыся лавкі,
Як селі пэрэзвянкі.
Шчэ й ліпшэй погнуцця,
Як горілкі нап’юцця.
(в. Знаменка, Брэсцкі раен)

На горі колодяц і вэдро,
Шось нашэй Манечкі нэ выдно.
Чы вітэ йіі до коморонькі сховалы,
Чы вітэ йіі по водыцэньку
послалы?
Як до коморы сховалы — вэрнітэ,
Як по водыцэньку послалы —
скажытэ.
(в. Знаменка, Брэсцкі раен)

Адна з найбольш яскравых лакальных вясельных традыцый Брэсцкага Палесся — песенная “сварка — спаборніцтва” паміж свахай ад маладога і “запарожцамі” — жанчынамі, якія афіцыйна не запрошаны на вяселле і таму па правілах павінны знаходзіцца за парогам (адсюль і іх назва). Мэта “сваркі” — адабраць у свахі сыр, які яна спецыяльна для гэтага выпадку і рабіла. Таму гэты звычай называюць яшчэ “сыра”. Адной свасе цяжка спаборнічаць з цэлай групай спявачак, таму “для сваіх когда — ж помогалы

такіе молодые жэншчыны. Вона ж сама свадьбу нэ пэрэкрычыть, як бы вона ні хотіла. Собіраюцца разом молодые жэншчыны, шоб вжэ воны знaлы тыйі всі ответы. Воны там як вріжуть, то вся свадьба почуе — хочыш ны хочыш".

(Валянціна Ігнацюк, 1941 г.н., в. Ляплеўка, Брэсцкі раен)

(Вясельны абрад "Сыра" №3 (19)-2017)

У гэтай весцы пасля "сыроў" бываюць "гоцкі": прыходзяць таксама "посторонніе", саджаюць бацьку і маці на лаўку і падкідваюць некалькі разоў угору — гэта "гоцкі", форма ўшанавання бацькоў. За гэта ім таксама даюць гарэлку і закуску, "і толькі насобіраецца, шо другу свадьбу можно ладыть".

(Валянціна Ігнацюк, 1941 г.н., в. Ляплеўка, Брэсцкі раен)

У доме маладога, як і ў маладой іх родныя абменьваліся падарункамі. Звычайна гэта было адзенне (сукенкі, сарочкі, хусткі) ці кавалкі матэрыі, "сколько договороно было в сватанні". У весках Брэсцкага раена памятаюць звычаі са "скрывальшчынай" — доўгім кавалкам палатна, які прызначаўся ў падарунак свекрыві. У розных весках свякроў здымала яго ў розныя моманты вяселля: у Знаменцы — неўзабаве пасля прыезду "пырызвян", у Ляплеўцы — перад зменай галаўнога ўбору маладой. У гэты час гучалі песні:

Ой, дэ тая маты,
Ой, дэ тая маты,
шо сына гудувала,
ночэнькі нэ спала?
Ныхай прыйдэ, ныхай прыбудэ,
скрывальшчыну здоймэ,
скрывальшчыну здоймэ.
(в. Знаменка, Брэсцкі раен)

Нэвісто моя жадана,
нэ рік, нэ два я жадала.
Нэ рік, нэ два я жадала,
поків я тэбэ дождала.
І тако во танцюе:
Ой, тыпэр я шырока,
ой, тыпэр я высока,
Ой, тыпэр я рада стала.
шо нэвісты дождала.
(в. Знаменка, Брэсцкі раен)

Зняўшы "скрывальшчыну", маці маладога танцавала з ей, а потым абгортвала або толькі галовы маладых



Фота з угалка этнаграфіі Ляплёўскага СК

(в. Ляплеўка), або іх тулавы (в. Знаменка) і тройчы злегку прыціскала маладых адно да аднаго, "шоб дружно жылі ў пары". Па традыцыі в. Знаменка "давней маты трымала той матэр'ял, і на смэрть з його сорочку шыла" (Вера Хальвіта, 1927 г.н.), а ў в. Ляплеўка свякроў кідала "скрывальшчыну" на печ, каб нявестка хутчэй прыжылася на новым месцы.

Змена галаўнога ўбору маладой ("уповыванне")

Пасля шлюбнай ночы маладая выходзіла да гасцей, як правіла, без фаты, але перад абдорваннем маладога зноў надзяляла яе. Гэта, відаць, звычай больш позняга часу, бо звесткі аб нормах ранейшых часоў іншыя: "Я — то знаю, як раньшэ, раньшэ, то ўжэ на другі дэнь нівестка в фате ны была. Ноччы прыежаем до жэніха, знымаецця в ночы той вэлен, і вжэ молодая врановстае і вжэв другей одежде, вжэ нэ в вэлёне. Одін — єдінственны дэнь нівэстка в вэлёне".

(Вольга Качалоўская, 1934 г.н., в Ляплеўка, Брэсцкі раен)

Заканчэнне вяселля

Апошні дзень вяселля (нашадаем. што на брэстчыне гулялі два ці тры дні) бадай што самы любімы ў вяскоўцаў. Гэты дзень ператвараўся ў сапраўдны народны карнавал з разнастайнымі пераапрананнямі, скокамі, музыкай.

Абавязковай часткай заканчэння вяселля было застолле і развітанне з маладой яе радні. Яно не суправаджалася абрадавымі дзеяннямі і праяўлялася пераважна ў песнях адпаведнага зместу:

Пропыла маты дочку,
На солодкум мэдочку,
На гіркій горэлоццы,
Ў батэнька в комороньцы.
Ны сама пропывала,
Родына помогала.
(в. Знаменка, Брэсцкі раен)

Паслявясельны перыяд

Першы дзень самастойнага жыцця ў сям'і мужа быў вельмі адказным для маладой жонкі: менавіта ў гэты дзень новая радня назірала, якая яна гаспадыня, якія ў яе здольнасці. Маладой нявестцы трэба было прынесці ў хату вядро вады і аддаць свекрыві *(в. Ляплеўка, Брэсцкі раен).*

Паўсюдна, на працягу тыдня пасля вяселля нявестка не мела права ісці да сваіх бацькоў. Праз тыдзень хто-небудзь з яе бацькоў ішоў (ехаў) да зяця і запрашаў у госці — "гостыну", "пэрэзву", на "пірагі", збіралася ці самая блізкая радня ці госці, якіх на свій выбар запрашалі бацькі маладога. Падчас застолля частаваліся, вялі сямейныя размовы, спявалі, але пераважна ўжо не вясельныя, а сямейна — бытавыя песні:

Ты, Тат'яна, ты, Тат'янушка,
Болыть у мэнэ головушка.
Болыть у мэнэ головушка,
Шо й чужая то й сторонушка.
Шо ны дойты, ны дойіхаты,
Свого роду ны одвідаты.
Ны журыся, моя мылая,
Пойдэм в гості хоть бы в сэрэду.
Пойдэм в гості хоть бы в сэрэду,
Я позаді, ты й попэрэду.
А мой мылы все попорэдэ йдэ,
Менэ, молоду, й узаду вэдэ.
Мэнэ, молоду, й узаду вэдэ,
Своей тэшчы на "дэнь добры" дае.
Ёму тэшча нэ отказуе,
Зетя сыном всё называе.
Ой, ты, зетю, ты мой сыноньку,
Узяў дочку, як алыноньку.
Узяў дочку, як калыноньку,
А высушыв, як білыноньку.
Ой, нэ я ее, маты, ссушыв,
Іссушыла тяжэлая вэсна.
В поле гноець роскідаючы,
До дытятка добегаючы.
(в. Ляплеўка, Брэсцкі раен).

Алёна ***ПАДДУБНАЯ***
Заўвага: *вытрымана асаблівасць мясцовай гаворкі*



Адкуль узяўся мядзведзь



Ці ведаеце вы, адкуль узяўся мядзведзь? Мядзведзь раней быў такім жа чалавекам, як і мы. Людзей тады было мала, і жылі яны па лясах. Там палявалі на звяроў і птушак. Улетку збіралі грыбы і ягады, капалі карэнне і запасілі на зіму. Але найбольш запасілі арэхі і мёд. Пчол тады было багата. Яны самі вадзіліся і ў дуплах, і ў зямлі — у норах. Людзі шукалі пчол у дуплах, і хто першы знаходзіў, то абвязваў тое дрэва вяроўкаю, і ўжо ніхто не меў права іх чапаць.

Але жыў у той час адзін чалавек — гультай несусветны. Не хацелася яму самому шукаць пчол, дык ён выдзіраў чужыя. Жылося таму гультаю някепска. Растаўсцеў ён на чужым мёдзе, як калода зрабіўся. Ды вось бяда: цяжка яму стала лазіць на дрэвы па мёд... Пачаў ён думаць, што б такое зрабіць, каб лёгка было лазіць на дрэвы. Ды нічога не мог прыдумаць.

Дачуўся аднойчы гультай, што жыве за сямю лясамі ды за сямю балотамі такі чарадзей, які ўсё можа зрабіць. «Пайду, — думае, — да яго. Можа, ён зробіць мяне лёгкім».

І пайшоў да таго чарадзея. Ідзе лесам, бачыць — ліпа абвязана. Падышоў да яе, а там дупло зусім нізка, і ў ім поўна мёду. Выдраў ён мёд з дупла, наеўся і пайшоў далей. Ідзе, аж неўзабаве трапляецца другая абвязаная ліпа з пчаліным дуплом. Выдраў ён мёд і з гэтага дупла.

Ці шмат дзён ішоў ён, ці мала, нарэшце дайшоў да зямлянкі, дзе жыў той чарадзей. Пастукаўся ў зямлянку — ніхто не адчыняе: няма гаспадара дома. Сеў гультай, сядзіць. Аж бачыць — перад самым носам у яго ліпа з дуплом. Прывык гультай выдзіраць чужых пчол. Не стрымаўся і тут. Толькі ён пачаў драць мёд і ўплятаць за абедзве шчакі, як бачыць — ідзе гаспадар. Паглядзеў чарадзей на гультая, пакруціў галавою і кажа:

— Ну, чалавеча, за такую благую работу будзеш ты з гэтага часу толькі тое і рабіць, што драць пчол. І перавярнуў чарадзей таго гультая ў мядзведзя.

Дык вось адкуль узяўся мядзведзь. А хто не верыць — няхай зловіць мядзведзя і распытаецца ў яго, ці так гэта было, як казка кажа.

Источник:
https://belnaviny.by/belorusskie-skazki



Як курачка пеўніка ратавала

Жылі-былі курачка і пеўнік. Курачка яйкі несла, а пеўнік зярняткі здабываў, курачку частаваў. Выграбе з ямкі зярнятка і кліча курачку:

— Ко-ко-ко, Чубатка, знайшоў зярнятка! Вось аднойчы выграб пеўнік вялікую бобінку. «Ну, — думае, — гэтага зярняці курачцы не праглынуць, з'ем хіба сам». Праглынуў — ды і падавіўся. Паваліўся пеўнік, ногі задраў і не дыхае.

Падбегла да яго курачка: — Што з табою, Пеця? Чаму ты ляжыш і не дыхаеш? — Ой, — стогне пеўнік, — бобінкай падавіўся... — Як жа цябе ратаваць, Пеця? — пытаецца курачка. — Трэба, — шэпча пеўнік, — масла дастаць, горла змазаць. — А дзе яго дастаць? — У каровы.

Пабегла курачка да каровы: — Карова, карова, дай масла! — Нашто табе масла? — Пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся. — Добра, — кажа карова, — дам я табе масла. Але схадзі спярша да касцоў, папрасі сена.


Прыйшла курачка да касцоў: — Касцы, касцы, дайце сена! — Нашто табе сена? — Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

— Схадзі да пекара, папрасі пірагоў. Пірагі мы з'ядзім, тады і сена накосім.

Прыйшла курачка да пекара: — Пекар, пекар, дай пірагоў! — Нашто табе пірагі? — Пірагі — касцам. Касцы накосяць сена. Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.


Пекар кажа: — Збегай у лес, прынясі дроў, каб было на чым пірагі пячы.

Пабегла курачка ў лес і прынесла дроў. Пекар напёк пірагоў. Занесла курачка пірагі касцам. Касцы з'елі пірагі і накасілі сена. Прынесла курачка сена карове. Карова з'ела сена і дала масла. Пеўнік змазаў маслам горла і праглынуў бобінку. Праглынуў і зноў весела на ўвесь двор заспяваў: — Ку-ка-рэ-ку! Чуб-чубатка — маладзец! Тут і казцы канец.





Вужалка



«Жыла ў вёсцы адна сям'я, бацькі ўжо даўно не было — кажуць на вайну як пайшоў, так і не вярнуўся. Мабыць забілі, а можа, як пляткаркі шапталіся — й кінуў жонку з дзьвумя дзецьмі. Жылі яны ўтрох бедна. А тут па зімку, калі марозы лютавалі — маці хвароба скруціла, а да сакавіку яе ўжо на могілкі адвезлі. Старэйшаму сыну па той вясне гадкоў чатырнаццаць стукнула, а малодчаму — таму так наўвогуле яшчэ каля дзесяці было.

Малыя ўдзьвух засталіся, жылі ў сваёй старой хаце, суседзі дапамагалі, ў чым была патрэба, алеж хлапцы самі сабе былі.

Малодчы ж пасля матчынай смерці дык наўвогул з глузду з'ехаў. Ад людзей хаваўся, размаўляў па-малу, яго з той пары ўсе на вёсцы дурненькім лічылі.

Пайшлі раз браты ў лес, па дровы. Нарубілі, ды вяртаючыся да дому ўбачылі пад старым дубам вужаку, зусім маленькую — на дзьве далоні ўздоўж.

Старэйшы брат сякеру ў яе кідануць хацеў, але ж малодчы заступіўся. Кажа, нельга так рабіці — жывая яна, ў яе мабыць таксама сям'я ёсць. Той і адступіўся — што з дурня ўзять, хай сабе на вуме. А ён вужаку за пазухай схаваў дый да хаты ўпотайкі прынес.

Пасля ўсюды таскаўся з ёй, як іншыя малыя кацяня ці шчаня за сабой цягаюць. Нікому не паказваючы, ціханька размаўляў з ёю, калі нікога паблізу не было. А аднойчы, калі хлапец да калодзежу пабег, а змяюку сваю ў хаце пакінуў, да ранку застудзіць яе баяўся — яна па падлозе папаўзла, дый старэйшы брат, данізу не гледзячы — наступіў нагой, а спужаўшыся, што ў хаце змяя — лапатаю яе й забіў. Малы, калі ўбачый яе нерухомую постаць — зусім звар'яцеў, на брата кінуўся, потым зхапіўшы вужаку, ў лес збег. Кажуць, пад тым жа дубам пахаваў яе, дзе й знайшоў. А вярнуўшыся — зусім не свой быў.

З часам забывацца той выпадак стаў. Браты жылі моўчкі — разам, але ж як чужыя.

Па восені как-та пайшоў старэйшы адзін па грыбы. Два дня не было. Шукаць яго сталі — на трэці дзень у вечары знайшлі нежывога. Ляжаў спіной да неба, пакусаны па ўсім целе. Ніхто паверыць не мог, што змеі чалавека апанавалі.

Пасля яго смерці малодшага брата ніхто ў вёсцы й не бачыў. Кажуць, у лес пайшоў да сваёй вужалкі. Гавораць — ад яго цяпла ажыла яна прыгожай дзяўчынай, скарбы свайго роду адчыніла яму. Мабыць і не так усё было, але ж да людзей хлапец так і не вараціўся.»

Источник:
https://belnaviny.by/belorusskie-skazki

Народныя святы і звычаі Берасцейшчыны



«А перад Раством елі рыбу»: рыба ў народных уяўленнях берасцейцаў



Іна ШВЕД,
доктар філалагічных навук,
кіраўнік лабараторыі
«Фалькларыстыка і краязнаўства»
БрДУ імя А. С. Пушкіна

Практычна ўсе каляндарныя і сямейныя абрады і звязаныя з імі вербальныя тэксты, а таксама неабрадавы фальклор берасцейцаў, як і іншых беларусаў, актыўна выкарыстоўваюць сімволіку вобраза рыбы.

Рыбе прыпісваецца шэраг стэрэатыпных характарыстых, якія пераважна звязаны з яе водным ладам жыцця. У загадках звычайна гаворыцца пра асаблівасці перасоўвання рыбы: «Нэ рыба, а плывэць, нэ конь, а ходыць, нэ піла, а рэжыць. — Бабёр» (Кустын Брэсцкага р-на). Менавіта спецыфіка перасоўвання і марфалогія рыб, паводле загадак, вызначае іх сярод іншых жывёл: «Ног няма, а ходзіць, крылы есць, а не лятае. — Рыба» (Орхава Брэсцкага р-на). З рыбіным хвастом уяўлялі міфалагічную жыхарку вады — русалку. Разам з тым лічаць, што ў вадаёмах, якія асэнсоўваюцца як нячыстыя, чорныя, паўсталыя на месцы правалішчаў, рыба не водзіцца. Напрыклад, у Белаазёрску апавядаюць, што ў Чорным возеры (у адрозненне ад Белага) рыба не водзіцца.

У розных жанрах фальклору падкрэсліваецца *калектыўны*, нават *сямейны* характар жыцця рыб. У гэтым плане паказальна, што добры ўлоў рыбы магічным чынам намагаліся забяспечыць, просячы першую злоўленую рыбу прывесці *ўсю сваю радзіну*: «Як пэршый раз зайдэш ловыты рыбу на канаву, як зловыш пэршую рыбу, то трэба вырваты в воді травынку і тэю травынкою ее вытяты тры разы — тую рыбку, шо зловыв. І казаты: «Іды по батька, іды по матэра, іды по всю свою родыну і вэды сюды». І пускають ее в воду. Шоб рыба добрэ ловылася» [1, с. 624].



Актыўна міфалагізуецца такая характэрная прыкмета рыбы, як адсутнасць успрымальнага чалавечым вухам голасу, «*немата*». Паколькі цішынёй, нематой, адсутнасцю гукаў у міфапаэтычнай мадэлі свету характарызуюцца засветы, міфалагічнае мысленне зблізіла *рыбу* і *душу чалавека, які памёр*, пайшоў на той свет, ці *душу дзіцяці, якое яшчэ не з'явілася на белы свет*. Гэта вызначыла сімвалічную суаднесенасць рыбы і са смерцю, і з нараджэннем чалавека. Паводле прыкметы, калі хворы чалавек просіць рыбы (ці малака або мёду), ён хутка памрэ (Сухарэвічы Брэсцкага р-на). Пабачаная ў сне рыба, які нябожчык,вяшчуе смерць (ці дождж): «Еслі сніцца... пакойнік ці рыба якая, нікога не спрашуйце — будзе дождж...» (ФА; Мачуль Столінскага р-на).

Лучнасць рыбы з засветамі і душамі, якія там знаходзяцца, прадстаўлена ў загадках.Рыба, як ужо адзначалася, магла ўяўляцца ўвасабленнем душы памерлага чалавека, які знаходзіцца на тым свеце, — гл. загадку пра рыбу: «На тым свете жывы, а на гэтым мёртвы»(ФА; Слаўнае Кобрынскага р-на). Гэта значыць, што душа памерлага чалавека ўвасабляецца ў рыбе да моманту новага нараджэння. У баладах пра тое, як дзеўка нарадзіла дзіця не ў шлюбе і ўтапіла яго ў рацэ, рыбары думаюць, што злавілі рыбу (ліня), але гэта аказалася немаўля: «Дай наіхалы, дай рыбачэнькы рыбку ловыты, // Дай нэ выловылы рыбы-шчукі, // Выловылы лыня, выловылы лыня, // Разгляділыся, разгляділыся, // Аж малеэ дытя, аж малеэ дытя. // Дай взялы ж його, // Понэслы у казёный дом, у казёный дом. // — Дай збырайтэся, красные девочкы, дай на прыговор, дай на прыговор, // Ох, котора ж красна девіца // Дытя вродыла, дытя вродыла ж, // Нэ мусыла ж дай годоваты, // В рэчку бросіла, у рэчку бросіла, // — Ой, плывы ж, плывы, // Дай, малэ дытя, на ныз з водою, на ныз з водою, // Ох, я ж пойду дай погуляю, хоча ж бэдою, хоча ж бэдою, // Шчо ж людскы девкы да людскы красны // Вэсэло поют, вэсэло поют, // А Марусеньку помалюсеньку под ручкі вэдут, под ручкі вэдут. // Ох, а за єю бацько і маты плачут, рыдают, // Плачут, рыдают. // — Ой, не плач, бацько, // Дай нэ плач, маты, // Естя ў дома пять, естя ў дома пять, // Дай нэ пускайтэ дай на вулочку, // Нэхай дома сплять» (Стахава Столінскага р-на), «Ох, у нашай весачкі вяліка навізна, // Маладая Кацярына сына радзіла. // Яна яго спарадзіла ў

Дунай бросіла. // Пайшлі хлопцы-рыбалоўцы рыбу лавіць, // Не паймалі шчукі-рака, а паймалі ліня. // Разглядзелі, паглядзелі — пекнае дзіця, // Аднěслі тую дзяціну ў казённы дом, // Палажылі ту дзяціну на казённы стол. // А ў нядзелю ўсе званы равуць, // Маладу Кацярыну хаваць нясуць. // А за ёю старая маці плача, рыдая: //– Не плач, стара маці, не плач, не рыдай, // Калі маеш дочкі дома, // Гуляць не пускай» (Заполле Івацэвіцкага р-на).

Паводле шматлікіх запісаў, рыба, пабачаная ў сне, вяшчуе жанчыне цяжарнасць: «Рыбу [сніць], абязательно к берэміннасці» (Хмелева Жабінкаўскага р-на), «Яйца, рыбка, петух [сняцца] к детям» (Брэст), «Я была молодая, сню: рыбу ловлю — потоўшчаеш, это перва прычына» (Бродніца Лунінецкага р-на). «[Што сніцца да цяжарнасці?] — Ну мне лічно снілась, што я рыбку словіла» (Люта Брэсцкага р-на). З уяўленнямі пра рыб як пра *іпастасі ненароджаных дзяцей* звязана і наступнае тлумачэнне сну: «... Як хто малады, да кажа, от прыснілось, цем болей — это расказуюць, як забярэменее да прысніцца, што шчуку паймаеш ці плотку, як шчуку — то хлопец, а як плотка — то дзеўка будзе» (Мачуль Столінскага р-на). У аповедзе жыхаркі вёскі Вялікія Радванічы пра сны, якія вяшчуюць цяжарнасць, прысутнічаюць і рыба, і баранчык, і курыца з куранятамі: «Рыба, наверно, к беременності. <...> Ну, бабушка, свекруха тут моя жывёт. Говоріт: «Женя, сон пріснілся: барашечік такой чёрненькій, барашічек вот». Звоню туда в Россію — внучічек роділся. А когда-то у меня вот два сына і дочка. Я ходіла беременная. Моей крёстной сніпся сон. Говоріт, это самое, заготавлівает сено. Ей сніпся, что оні заготавлівают сено, а і я тоже. Заготавлівала сено — і куріца с цыплятамі. І говорят: «Ооой, смотрі куріца с цыплятамі!» Да. А я говорю: «Ооо — это моя». І взяла эту куріцу. І крёстная говоріт, маме моей расказывает, говоріт, шо такой сон пріснілся. А мама говоріт, шо Женя дівчіну вродіть. І точто, девочка — квактуха. Куріца — она моя. І была девочка». У матрыманіяльны кантэкст (праўда, з адмоўным значэннем) рыба ўпісана ў наступным тлумачэнні сну: «Калі дзяўчына прысніць рыбу, значыць нешта будзе не ладна з бракам у яе, еслі каня, значыць будзе жаніх, маладой такой конь» (Тальмінавічы Ляхавіцкага р-на).

Узаемазалежнасць, *паралелізм існавання рыб і людзей* выяўлены ў розных аспектах, у прыватнасці ў народных тлумачэннях сноў: калі прыснілася жывая, цэльная, рухомая рыба, дзеці будуць жыць, расці здаровымі, а калі нежывая ці хворая — памруць, будуць хварэць. Так, нежывы, нерухомы акунь, пабачаны ў сне, варожыць нараджэнне хворага хлопчыка ў аповедзе жыхаркі вёскі Сухарэвічы: «В мынэ срэдні [сын] родывса, то був пуповіною обмотан. Вона [павітуха] отматала, а він ны говорыть, ны пышчыть і ны плачэ. То вона хучій із ротіка высысае і з ух повысысала. А він вжэ так запышчав, як тое котыне, во. А мне прыснылось, шо это (чы мне, чы мужыковы, вжэ я забулась) — окуня, окуня зловыв. І гэто, зловыв окуня, вытягнув на бэрыг. А він, кажэ, якіся ны такый, він як ны жывый».Іншая жанчына апавядае, як прысніла рыбу, палова якой «адпала», і асацыюе яе з народжанай памерлай дзяўчынкай, палова цела якой было чорным: «Знай, еслі сныцца сон і рыба, гэто знай, шо діты. Гэто шо-то такэ з дітьмы. Я тобі шэ про сэбэ роскажу. Я выйшла замуж, родывса в мэнэ одын сын, потом другый. А тоді вэльмы трудно було, бо калхоз строілы, да бідно було, да як іх годуваты? А тут і знаеш шо було, всі хотілы, шоб куда дытэй гучыты, шоб ны уставалыс у калхозы, шоб ны копалы зэмлю, да ны крутылы куровам хвосты, ну шоб шлы куды хто учытыс. Ну два хлопцы в нас е, ну й добрэ. Вжэ быто крохы стало ліпш, сталы багаччы, сталы зароблятьы. Ну трэба шэ нам дівчына. Оооооой, ну я быто вжэ й знаю, шо тая дівчына вжэ й будэ в нас. Сныцца мні, шо там далёко, дэ гай, там луг такый був і там така чыста вода була, гэто було правда. Мні сныцца, шо я там со своім Мішыю [муж]. І мы, кажыцца, сыдымо, а сонцэ свэтыть, а в воді отражаецца сонцэ. Мні так сныцца, шо быто я бачу, шо в воді так отражаецца гэтэ сонцэ. Да я кажу: «Міша, бач як отражаецца сонцэ». Він кажэ: «Я бачу». А така маленька рыбына плывэ, така во рыбынка. Плывэ й плывэ, плывэ й плывэ. А я кажу: «Я зарэ піду йіі возьму». Міша кажэ: «А як жэш ты йіі возьмэш?» Я кажу: «Возьму». І я быто встала і пошла-пошла по воді і доходю. І тая рыбынка, я за тую рыбынку. І взяла, взяла я тую рыбынку, а полувына тэй рыбынкы і отпало, а полувына в мэнэ на руці остало. Ну сон такый сон, шэ я й мамы своюй пукойной кажу, а вона сказала, шо гэто такый ны добрый сон. Я была беременна і була в мэнэ девочка. І була такая, шо я йіі ны родыла. В місяцув 4, можэ й 5, я в Пінску іі родыла, як я йіі там родыла, я вжэ ны знаю як і росказаты. Гэто було давно і вжэ ж такэ діло, він прыіхав і йіі забрав (муж). Шо там, то я і ны бачыла, ны хочу казаты. Закупаты трэба. В мэнэ свікор був на моглыцах, могылу роскупалы, ну шо ж там, такэ малэ. І йіі заныслы туды до моглыц, каля свікра закупалы. Вжэ все зробылы, молылыс. І потом ля мэнэ моя мама кажэ: «Голя, девочка була, но полувына була так нормальнэ тіло, а полувына такэ чорнэ і вжэ быто розлагалос». От як ля мэнэ рыбына снылас. Я то ны бачыла, но гэто такэ було в мэнэ. Вот такый в мэнэ явный сон був, можна сказаты быто указательный по Божому сон» (Сухое Іванаўскага р-на). Жыхарка вёскі Запруды згадвае, як пабачыла ў сне, што злавіла шчуку, выкінула яе на бераг і рыба стала задыхацца. Сон вытлумачыла як прадвесце нараджэння дзяўчынкі. Калі жанчына нарадзіла дачушку, немаўля задыхалася, бо шыя была абматана пупавінай (Кобрынскі р-н). І паколькі сон успрымаецца як непасрэдны канал камунікацыі між тым і гэтым светам, жанчына, якая бачыць у сне рыбу, глядзіць на саму душу, якая хутка ўвасобіцца ў яе дзіцяці. Нездарма дзіця ў загадцы паўстае як рыба: «Сярод хаты лужа стаіць, а на лужы рыба ляжыць». На Вялікдзень у Пінскім раёне вадзілі танок і выконвалі песню любоўна-эратычнага характару: «...роспрэкрасны козак. // Ой, шчо жэ мні наробэв, чорны, // Шчо й у мэнэ жыволок повны. // Ой, шчо жэ мні наробэв, Яша, // Шчо й у мэнэ в жывоті пляша. // Ой, чы рэба, чы рыбыночка, // Чы малая да й дытыночка. // Ой, чы рэба, чы карасычок, // Чы маленькі Опанасычок» [1, с. 36]

З уяўленнямі пра душы ненароджаных дзяцей у абліччы рыб звязаны не толькі народныя тлумачэнні сноў, паводле якіх рыба вяшчуе жанчыне цяжарнасць, народзіны хлопчыка (акунь, карась, лінь, шчупак, язь) або дзяўчынкі (шчука ці дробная рыба), але і казачныя сюжэты пра гераіню, якая з'ела рыбку і ў выніку нарадзіла дзіця. У сувязі з сімвалізацый рыбай пладнасці, нараджэння, эратызму характэрны сюжэты чарадзейных казак тыпу «Іван Сучкін сын», у якіх з'яданне рыбы адпавядае працэсу апладнення: злоўленую рыбаловам рыбу з'ядаюць царыца, кухарка і кабыла ці сучка, у выніку

чаго ўсе тры цяжараць і нараджаюць па сыну.

Любоўна-шлюбная сімволіка рыбы, яе асацыяцыя з *эратычным пачаткам* выяўлены ў міфапаэтычнай карціне з'ядання рыбкі зперцам, пятрушкай ці алейкам, як у песні: «Кума мая, кумачка, дзе жывеш? // Чаму мяне ў госцейкі не завеш? // — Ці ты куме, куме, розу не маеш? // Ці ты маёй хатачкі не знаеш? // А вунь мая хатачка ля вады, // З высокага дзераўца з лебяды. // Яшчэ к хаце сеняйкі прыпляту, // З харошага дзераўца з асату. // Тады цебя ў госцейкі пазаву, // Як свежае рыбачкі навару. // А свежая рыбачка акунёк, //А любімы госцічак мой кумок»(Рухча Столінскага р-на).

З рыбай як сімвалам *нараджэння, новага жыцця*, што ўвасобілася ў хрысціянскай традыцыі («рыбінай» метафорыцы Хрыста), звязана пашыранае ў славян ужыванне рыбы як *абрадавай ежы* на Каляды, перад Раством. Гатаваная рыба, розныя стравы з ёю былі таксама абавязковай часткай памінальных вячэраў на Куццю, Дзяды («О, тоды моя свекруха празновала тые Дзеды, это для ее было! Не знаю, она не одзін празднік не пропускала, тыяДзеды. Она варыла некі квас, кашу якуюто, перловую, чы... Не знаю, шо-то такое она варыла. То з грыбамі шо-то, то з в'юнамі. Тые разы така рыба была — в'юны сушоные. Она наварыць шо-то такого. Очэнь вкусно она наварыць на Дзяды, як нікогда такого не было» (Лунінец). У песнях (сямейна- і каляндарна-абрадавых і інш.) рыба выступае рытуальнай ежай, пачастункам. Пэўныя перасцярогі звязаны з ужываннем рыбы ў ежу: «не трэба есть рыбу с головы, бо наклічешь беду» (Яжэўкі Лунінецкага р-на).

У замовах з матывам трох цароўгаспадароў, маркераў трох складнікаў светабудовы можа актуалізавацца сімвалічная суаднесенасць рыбы, месяца, звера ці каменя як «цароў» адпаведных чыннікаў светабудовы («Молодый месяц, ты на небе, ліст на дрэве... камень у полю, рыба в морю...» [1, с. 644], «У лесе заяц, на моры рыба. // Як воны вместе сойдуцца, // так у (імя) зубы заболят»[1, с. 639]. (Дарэчы менавіта заяц і рыба згадваюцца ў прыказцы пра паляўнічага і рыбара: «Рыба і зайцы — завядуць у старцы»).

Суаднесенасць рыбы (шчукі) з касмічным нізам, засветамі і адначасова проціпастаўленасць касмічнаму верху паэтычна абыгрываюцца ў песенным матыве «шчука-рыба возьме цела, а анёлы — душу»: «... Подїйіжджаю до Дунаю, // Сам я думаю-гадаю: // Чы з коня убіцца, // Чы в Дунай втопіцца, // Чы додому воротіться? // Шчука-рыба возьмэ тіло, // А ангелы возьмуть душу, // А ты рэчушка, а ты быстрая, // Выкыдай косты на сушу» (Калілы Іванаўскага р-на).Непарыўная сувязь рыб *з воднай стыхіяй* выяўлена ў тлумачэннях сноў пра рыб як прадвесце дажджу або снегу(нябеснай вільгаці) ці слёз, мочаспускання (чалавечай вільгаці). «[А калі сніцца рыба, то гэта да цяжарнасці?] — Не, кажуць, як рыба сніцца, то можешь обмочытыся ў посцель» (Калілы Іванаўскага р-на), параўн. «налавіць рыбы» — памачыцца ў штаны (пасцель).

Рыба магла надзяляцца *ахоўным, апатрапейным* значэннем і выкарыстоўвацца ў народна-медыцынскіх практыках. У замовах рыба акрамя ўзгаданай вышэй касмалагічнай сімволікі надзяляецца *медыятыўнай* семантыкай, функцыянуе ў якасці *сакральнага памочніка*, якомуахвяруюць хлеб-соль і ўзамен чакаюць здароўя, напрыклад: «Іду я к мору з вялікага гора, а ты, рыбка, страпяніся, ад гора адбіся. За тваю дабрату хлеб-соль кладу. Хлеб-соль прынімай і здароўем (імя) надзяляй» (Падлессе Ляхавіцкага р-на).

Дасёння на Брэстчыне бытуюць аповеды, што ўюны з'явіліся *ад цвікоў*, прызначаных для ўкрыжавання Хрыста: «І цыганку не можна [праганяць], усегда мама казала цыганам даваць. Патаму шо як Ісуса Хрыста прыбівалі, так яны кралі цьвікі ад етых во, хто Яго прыбіваў. І кідалі то туды, то туды. Гэты цьвікі падалі ў воду — то это ўюны Бог паслаў людзям. Уюны. <...> Адзін раз ўюноў налавілі багато, так мама кагэ: «От Гасподзь Бог паслаў... Гэтыя гвоздзі вялікіе, што прыбівалі»« [1, с. 409]. У вёсцы Вічын апавядаюць, што Ісуса Хрыста распіналі вельмі дарагімі цвікамі. Яўрэй, каб выратаваць Хрыста, украў цвік і схаваў у сябе ў валасах. Ахоўнікі схапілі яго, паставілі на калені і вымусілі пакланіцца. Калі яўрэй гэта зрабіў, з яго валасоў выпаў цвік і ператварыўся ва ўюна. Таму ў яўрэяў кучаравыя валасы (Лунінецкі р-н). Жыхар вёскі Спорава — выдатны майстар па вырабу чаўноў — апавядаў нам, што калі ў старажытныя часы ў суседняй вёсцы рыхтаваліся распяць Хрыста, адзін цыган украў цвік, закруціў яго ў валасы і пабег з ім ад праследавацеляў у бок Спорава. Ля Спораўскага возера цыгана насціглі і ён быў вымушаны закінуць цвік далёка ў возера. З цвіка развялося ў возеры шмат вугроў, якімі дасёння харчуюцца спораўцы.

Лучнасць рыбы з ніжнім ярусам светабудовы, засветамі магла матывавацьяе міфапаэтычную сувязь з *багаццем, грашыма, прыбыткам*. Так, у народных тлумачэннях сноў рыба часта абазначае прыбытак, добрае завяршэнне спраў («Рэба — это прыбыль» (Ляплёўка Брэсцкага р-на)) ці яе вобраз тлумачыцца агульна: «Кажуць, як рыба, то добра» (Мачуль Столінскага р-на). Немалаважную ролю ў такіх асацыяцыях адыграў і серабрысты ці белы колер лускі ды яемноства (як мноства бліскучых круглых манетак.

Міжжанравым можна лічыць матыў «рыба не можа жыць без вады (выдатна пачувае сябе ў вадзе)» — гл. прысушку: «...так бы она (раба Божия) сохла, как каменная трава в поле; как не может быть рыба без воды, так бы не могла быть она без меня, раба Божия (такого-то) (Дзягелец Бярозаўскага р-на), песню: «Ой лугі з лугамэ, // А рыба з водою, // Отдала мынэ маты // Замуж молодую...» (Кавярдзякі Брэсцкага р-на). Сімволіка вялікага жыццёвага патэнцыялу, пазітыўнай дынамікі, маладосці, «ярасці» транслюецца праз сімвалічную карціну «рыба гуляе з вадою», якая можа функцыянаваць як складнік параўнання (напрыклад, у каравайнай песні: «Короваю-раю, // Я з тобою граю, // Як рыба з водою, // Так я із тобою. // Наш коровай высшый, // Наша молодая хорушша!» (Спорава Бярозаўскага р-на) і проціпастаўляцца негатыўным праявам чалавечага жыцця: «Ой под мостом рыба грае, // На берегу песок лежыт, // Там бедная девчонка плачэ, // І по ліцу слеза бежыт» (Плешчыцы Пінскага р-на). Матыў разлукі рыбы з вадою актуалізуецца з мэтай выявы цяжару разлукі блізкіх людзей: «Твая водка вельмі горка, // Твая маці чараўніца, // Старша сёстра разлучніца. // Разлучыла нас з табою, // Як рыбаньку і з вадою, // Ой рыбанька па Дунаю, // А я выйду падумаю» (Іванава Брэсцкай вобл.).

У песняхса шлюбна-этатычнымі матывамі *гулянне рыбак па вадзе* (моры) ці *з вадой* сімвалічна праецыруецца на *дзявочае гулянне*, на залёты дзяўчат і хлопцаў. У песнях на любоўна-шлюбную тэматыку шчука ці іншая рыба вы-

ступае прыроднай параллелю *дзяўчыны, нявесты, маладзіцы, свацці.*

У песнях з матывам «смерць-вяселле» малойца «рыба без'языка» можа выступаць музыкам, а група рыб — «госцейкамі»: «Ходыла Наденька по новым горідцу, // Купала градочкі, сіяла руточку. // Ставшы, посіявшы, стала полываты, // Ставшы, полывавшы, сіла спучываты. // Сівшы, спучівшы, стала нашчытала, // Ставшы, нашчытавшы, у выночок звыла, // У выночок звыла, на Дунай пустыла: // Хто выночка споймэ, то той мэнэ вузьмэ. // Хвалывся хвалько — молоды Іванко: // — Я выночка спойму, я Надечку вузьму. // Як ступыв ногою — по пояс водою, // Як ступыв другою — на дно головою. // — Бэжы ты, коню, з сыдлом додому, // Ны кажы ты, коню, шо я ўтопывся, // А скажы ты, коню, шо я ўжэнывся, // Взяв собі жіночку — у моры шчучочку, // Взяв собі музыку — ***рыбу*** бэз'языку, // А мої гостонькы — у моры рыбонькы» (Плоска Брэсцкага р-на).

Рыбкай ласкава называюць дзяўчыну, каханую, нявесту: «Выйды дівчыно, выйды, рыбчыно, // Поговорымо с тобою. // — Ой, як жэ ж мні выходыты, // С тобой, сэрцэ, говорыты...» (Калілы Іванаўскага р-на), «Ой, у полі озэрэчко, // Там плавало вэдэрэчко. // Соснова клэпка, // Дубовэ дэнцэ, // Нэ цурайса, мое сэрцэ. // Там плавало шчэ і другое, // Половына з водою. // — Выйды, дзевчына, // Выйды, рыбчына, // Поговорымо з тобою» (Ласіцк Пінскага р-на), «Дзівонько-рыбонько, шо будэ? // Хто ж тэбэ до шлюбу одвэзэ? // Хто ж твою косу расплэтэ? (Белін Драгічынскага р-на).

Вобраз рыбы можа па-рознаму паэтычна суадносіцца з *доляй/нядоляй* лірычных герояў, напрыклад:«— Закідайце сетку цераз быстру рэчку // Ды паймайце долю мне, беднаму малойцу. // Не паймалі долі, ды паймалі шчуку. // Рыба-шчука грае, сабе пару мае, // А я, бедны хлопец, парачкі не маю. // Ой, пайду я з гора ў чыстае поле, // Пайду ўтаплюся, бо долі не маю» (Іванава Брэсцкай вобл.).

У пазнейшых па паходжанні песнях і прыпеўках на любоўную тэматыку вобраз рыбы фармалізуецца ў большай ці меншай ступені: «Дарагую рыбу ела, // Ў рыбі сэрца відзела, // Каго любіла, уважала, // Мама ненавідзела» (Вільянава Пружанскі р-н), «У рэчку семячкі бросала, // Рыба семячок не ест, // Із чужой дзярэўні парэнь // Нікогда не надоест» (Бакуны Пружанскага р-на), «Эх Семеновна в реке купалася, // Большая рыбіна в трусы попалася» (Туры Столінскага р-на).

Парэміі, выслоўі з вобразам рыбы шматаспектна характарызуюць людзей, сацыяльныя адносіны ў грамадстве, выяўляюць эмацыянальныя, маральныя, этычныя рэакцыі і паняцці, напрыклад: «У язя ў галаве, што ў князя, а ў шчукі, што ў удавы» (Парахонск Пінскага р-на), «Хочаш рыбы налавіць і штаноў не намачыўшы» (Бакуны Пружанскага р-на), «У каламутнай вадзе добра рыбку лавіць» (Соргавічы Баранавіцкага р-на), «Б'ецца, як рыба об люд» (Спорава Бярозаўскага р-на), «Рыбка ў рацэ, ды не ў руцэ» (Ціхны Бярозаўскага р-на), «На бэзрыб'і і рак рыба», «Во тобі, шчука, навука», «Крутыцца, як ўюн на жарануй сковороді» (Хомск Драгічынскага р-на), «Задрамала як шчука ў іле» (Горталь Івацэвіцкага р-на).

Вобразы рыб прадстаўлены ў шэрагу паданняў пра назвы ландшафтных аб'ектаў, вёсак і гарадоў. Так, пра назву Століна апавядаюць наступнае: некалі частку Століна, ад будынка гарсавета да праваслаўнай царквы, займала вялікае возера. У гэтым возеры было злоўлена сто лінёў. Адсюль паселішча атрымала назву Столін. Падчас лоўлі рыбы могуць адбывацца розныя здарэнні, весціся дыялогі паміж героямі ў наратывах, гумарэсках, песнях, напрыклад:«Паехалі неяк спараўцы за возера лавіць рыбу. Ноч была халодная. Распалілі вогнішча. Багацейшы з іх лёг спаць, накрыўся кажухом і заснуў. А ў бяднейшага кажуха не было. Вырашыў ён: «Няма ў мэнэ кожуха, то хай і ў тэбэ ны будэ». І падпаліў кажух таварыша. Калі выгарэла добра дзірка, пачаў будзіць ён багацейшага за сябе: «Вставай, братко, ты ж горыш!» Той усхапіўся, пабачыў палаючы кажух і стаў дзякаваць: «Дзякуй тобі, шо розбудыў мэнэ, а то згорыў бы і кожух муй, і я» (Спорава Бярозаўскага р-на).

У тэкстах розных жанраў частотнай з'яўляецца пара вобразаў *«рыба / рак»*, напрыклад у жатоўнай песні: «Посіеў дід грэчку, // Баба кажэ: мак. // Гоп, гоп, жынка моя, // Нэхай будэ воля твоя, // Нэхай так, нэхай сяк, // Нэхай грэчка будэ мак. // Ек поймаў дід шчуку, **//** Баба кажэ: рак. // Гоп, гоп, жынка моя, // Нэхай будэ воля твоя, // Нэхай так, нэхай сяк, // Нэхай шчука будэ рак. // Ек купэў дід вэдро, // Баба кажэ: глек. // Гоп, гоп, жынка моя, // Нэхай будэ воля твоя» (Закозель Драгічынскага р-на). Вобраз залатой рыбкі, вядомы, сярод іншага, з літаратурнай казкі, выступае прэцэдэнтым феноменам у фальклорных творах даволі позняга паходжання, напрыклад у прыпеўцы («Рыбка, рыбка залатая, // Прыплыве ў наш калгас, // Старшыня цябе шукае, // Бо саляркі не прынас!» (Рубель Столінскага р-на)), жарце: «Адзін спаравец закінуў невад і выцягнуў залатую рыбку: «Змілуйся! — кажа рыбка, — я тваe тры жаданні выканаю» — «Добрэ, зробы так, коб замест воды ў возэры була гарэлка». Другое жаданне: «Шчэ гарэлкі». — «Ну, а трэцяе?» — «Даш шчэ бутылку з сабою да й плыві з Богам» (Спорава Бярозаўскага р-на).

У заключэнне падкрэслім, што міфапаэтычна значны сэнс атрымліваюць такія характарыстыкі рыбы, як водны лад жыцця і адпаведныя асаблівасці перасоўвання, «немата» (хоць рыбы здатныя выдаваць розныя гукі), бліскучая (белая) лузга, невыразныя вочы, гострыя зубы, абцякаемая стужкападобная, стрэлападобная ці іншыя форма цела і г.д. Рыба сімвалічна асацыюецца з касмічным нізам, воднай стыхіяй, дажджом, дэманамі, душамі памерлых ці яшчэ ненароджаных людзей.

Літаратура

1. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / А. М. Боганева [і інш.]. — Мінск : Выш. шк., 2008–2009. — Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн. — Кн. 2. — 863 с.



Прыйшла Пакрова, пытае, ці да зімы гатова

14 кастрычніка праваслаўныя адзначаюць Пакровы. У беларускім народным календары гэта канец збору ўраджаю, пачатак зімы і вяселляў, дзень, калі даведваліся пра надвор'е да самай вясны.

Па праваслаўным царкоўным паданні, свята Пакроваў Багародзіцы ўсталявана ў гонар выратавання Канстанцінопаля ад сарацынаў у 910 годзе. Калі вернікі маліліся аб перамозе над ворагам у храме, святы Андрэй пабачыў Маці Божую, якая пакрывала хрысціян сваім амафорам (пакровамі). У каталіцкім календары свята Пакровы адсутнічае.

Разам з Першай і Другой Прачыстай Пакровы ўваходзяць у лік «багародзіцкіх святкоў». Гэты дзень часам звалі Трэцяй Прачыстай. Пакровы выступалі адным з каляндарных рубяжоў між восенню і зімой, паводле павер'яў, у гэты дзень ужо мог легчы снег.

Казалі: *«Прыйшла Пакрова, пытае, ці ты да зімы гатова»; «Пакроў правярае гаспадароў»; «Прыйшла Пакрова — усохла / уціхла дуброва».*

На лугах ужо не хапае корму для жывёлы. Пакровы лічацца першым днём зімавання статку ў хлявах, хаця маглі пасвіць яшчэ і ў лістападзе. Гэта адлюстроўвалася ў прымаўках: *«Пакровы — хавай у хлеў каровы»; «На Пакрова дай сена карове»; «Пакрова — кії на дрова» (ужо не патрэбны пастухам).*

Дзяўчаты маліліся да Божай Маці, каб пакрыла іх галаву вясельным вянком ці жаночым галаўным уборам, як пакрывае зямлю снегам: *«Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку вяночкам»; «Святы Пакроў, пакрый ты траву лісцем, зямлю снегам, пакрый жа ты і мяне, маладу, чапцом!»*

Ад Пакроваў да Піліпаўскага посту (пачынаецца 15 лістапада) — пара вяселляў, Вялікая Вясельніца. Да гэтага часу ўжо збіралі ўвесь ураджай, было чым пачаставаць гасцей і быў час іх прымаць. Гэта адлюстроўвалася ў прымаўках: *«Як прыйдзе Пакрова, то жыва-здарова, як прыйшлі жніва, то ляжу нежыва»; «Святы Пакроў у гумно звозіць»; «Да Пакроў з поля ўсё далоў»; «Пакрова — дзеўка гатова, пакрова прайшла — дзеўка замуж не пайшла»; «Пакроў пакрываець зямлю лістом, ваду лёдам, пчалу мёдам, рыбу луской, а дзевак таской».*

На Пакровы, як і амаль на кожнае каляндарнае свята, прадказвалі надвор'е: *«Як на Пакрова дождж ідзе, то бортнік скача, а пахар плача»; «Як на Пакроў маладзік стане — лёгка будзе, як «у старом» — сільна зіма»; «Якое надвор'е ў дзень Пакрова, такое яно будзе і да вясны»; «З якога боку быў вецер на Пакровы, з таго боку ён будзе часцей дзьмуць і ў бліжэйшую зіму»; «Калі на Пакрову вее вецер з поўначы, то будзе зіма цяжкая. Калі з палудня, то будзе лёгкая»; «Калі каля Пакровы схвацяць маразы або выпадзе снег, зіма будзе лёгкая, а калі толькі восень доўгая – зіма цяжкая»; «Якая пагода на Пакрава, такая і на Раства»; «Не пакрылі Пакровы зямлі снегам — не пакрыюць і Каляды».*

Алена Ляшкевіч

Скарбніца народных талентаў



Вольга Сандрыкава: «У яе руках лялькі знаходзяць душы, і ажывае казка...»

Казачніца-пісьменніца. Лялечных спраў майстар. Рэжысёр сваіх спектакляў. Пранікнёна і шчыра злавіўшы добры настрой яна стварае свае лялькі, С каляровых шматкоў, гузікаў, пярынак, старых пацерак і акрылавай фарбы. Усё чаго яна тычыцца, ажывае і прачынаецца.



Сандрыкава Вольга Аляксандраўна нарадзілася 11 верасня 1975 года ў горадзе Брэсце. Вучылася ў 14 (цяпер гімназія №2) і 28 школах. Скончыла Брэсцкі тэхнікум чыгуначнага транспарту па спецыяльнасці «арганізацыя перавозак і кіраванне рухам на транспарце» ў 1995 годзе. Са жніўня таго ж года і па цяперашні час працуе на станцыі Брэст — Паўночны.

Замужам, двое дзяцей. Старэйшая дачка Дар'я, 22 гады, малодшая Наталля, 16 гадоў.

Творчы шлях Вольгі бярэ пачатак з самага дзяцінства. Бацькі, бабуля і дзядуля заклалі любоў да казак, легенд. З ранняга дзяцінства пачала складаць казкі з элементамі народнага фальклору і сямейнымі гісторыямі. Пазней па просьбе сваіх дзяцей іх запісала. Старэйшая дачка праілюстравала кнігу па яе казкам пад назвай «Мамчыны казкі».

З гэтага ўсё і пачалося. Далей напісала казку да 155-годдзя чыгункі «падарожжа Міхалінкі».

Кніга « Велікоднае святло» была выдадзена ў 2019 годзе, праілюстравана так сама старэйшай дачкой Сандрыковой Дар'яй.

Аднойчы на каляды...

1.

Было гэта, ці не было, але ж здарылася якраз на Каляды. Да бабулі і дзядулі дзеці прывезлі ўнукаў — хлопчыка Юрасіка і дзяўчынку Волечку. Жылі дзед з бабаю ў горадзе, на ўскраіне колішняй вёсачкі. А ў такіх старых мясцінах заўсёды ёсць свае казкі і паданні.

Дык вось, у самы святочны вечар, перад Калядамі, малыя вандравалі па сваіх старонках ў сацсетках, а дзед з бабуляй бавілі час перад тэлевізарам. Што ж яшчэ яны маглі рабіць, калі ўнукаў не цікавіла размова?

Аднак хутка старыя зразумелі, што патрэбна нешта змяніць, каб дзянькі, праведзеныя дзецьмі ў гасцях, сталі для іх цікавымі. Толькі падумалі пра гэты і раптам... у хаце замільгацела святло, а потым і зусім знікла. У акне з'явіліся калядоўшчыкі. Дзеці збянтэжыліся ад нечаканага візіту такіх незвычайных гасцей.

Бабуля тым часам запаліла свечку і адчыніла дзверы. Юрасік і Волечка накінулі паліто і выбеглі на парог. Цікава! Калядоўшчыкаў было шмат... Яны спявалі песні, зычылі гаспадарам





здароў'я, віншавалі са святам. Дружны карагод хуценька падхапіў бабулю з дзядулем, і яны танцавалі, як калісці ў сваім маленстве. Унукі з захапленнем глядзелі на іх, а потым ногі самі так панеслі іх у дзівосным танцы з прыстукамі.

2.

Калядоўшчыкі былі пераапранутыя ў розных казачных персанажаў. Самым галоўным з іх у карагодзе быў Дзед, што сімвалізаваў продкаў, сувязь паміж будучыняй і мінулым. Дзед вадзіў на ланцужку Мядзведзя, які, калі заспявалі песню, пачаў пацешна кружыцца вакол сябе, прыстукваць лапамі. Мядзведзь-гуляка сімвалізаваў здароўе, пладавітасць і сілу.

Быў там таксама і чалавек, пераапрануты ў Бусла. Галава птушкі была зроблена з дрэва і мацавалася на кій так высока, што здавалася: ён лётае ў небе і назірае, што рабіцца на гэтым падворку. Бусел — пасланец нябёсаў і сімвалізуе вышэйшы свет, куды пойдзе калі-небудзь кожны добры чалавек.

А яшчэ была з калядоўшчыкамі Каза — такая смешная! Яна тупацела



капытцамі і... нечакана паваліласяў снег. А калядоўшчыкі і кажуць:

Каза ў нас вучоная, любіць пачастункі, хоча падарункі.

Так добра яна скакала, зарабіла пачастункі?

Каб Каза наша ўстала, трэба даці ёй сала і святой вадзіцы з-пад крыніцы.

Каза, можа, хопіць ляжаць, трэба ўставаць?!

Бабуля пачаставала Казу салам, напаіла вадзіцай. Козачка і ўстала. Яна — сімвал ўрадлівасці і багацця. Калі Каза падае, яна нібыта"памірае", а з ёй — усё дрэннае, што было ў мінулым годзе. Каб новы стаў лепшым, Каза "ажывае"...

Не абышлося, вядома ж, і без Ваўка. Ён увесь час імкнуўся схапіць Волечку, але Юрасік абараніў сястрычку.

У рэшце рэшт усе сталі ў карагод, а дзядуля заспяваў сваю калядку:

Васылёва маты
Пошла шчодроваты.
На новае літо роды, Божа,
жыто, пшэныцу, горох, чэчэвыцю.

Бабуля тым часам зацягнула другую калядку:

Шчодровочка шчодровала
Да окінця прыпадала.
Шчодры вэчур настав,
Мэнэ батько послав.
Ріжтэ сала, кубасу
Я да дому понэсу.

Дзядуля — у адказ:

Гу-гу, дайте того, шо на рогу:
Кышкі кувбаскі,
Ше ложечку кашкі,
А ше того мала,
Дайте кусок сала.

* * *

Шчодрык, шчодрык, шчодровныця.
Лепей з маслом поляныця,
А бэз масла не така.
Дайтэ, тётку, пятака.
Не дасте нам пятака,
Возьму вола за рога,
Отвэзу я на торжок
І куплю там пырожок.

...Калі каледаванне скончылася, бабуля падзякавала гасцям, дала ім розных прысмакаў ды грошай. / Вярнуліся ў хату. Дзед сеў каля грубкі, у якой трашчалі паленцы... Тым часам, за вокнамі пайшоў густы снег. Пачыналася завіруха. Малых пасадзілі на ложак, які стаяў у маленькім пакоі насупраць печы. Бабуля запаліла свечкі, каб было святлей.

3

Волечка і Юрасік былі так уражаны прыходам калядоўшчыкаў, што ніяк не маглі супакоіцца. У такі дзівосны вечар хацелася яшчэ цудаў. Яны ведалі, што у бабулі з дзядулей ёсць казкі пря святочныя вечары ў іх мясцінах.

– Бабулечка раскажы нам казку, — стала прасіць Волечка.

Юрасік падхапіў гэту просьбу.

Спярша бабуля адмаўлялася... Тады дзед таксама пачаў прасіць казку. Як тут не паслухацца? Бабуля не ўтрымалася і пачала расповед:

– Калісьці на захадзе зямлі беларускай жыў чалавек, якога клікалі Барысам. Быў ён вельмі працавіты, але як ні стараўся, усё роўна гаспадарка яго была слабая. Вельмі хваляваўся пра гэта Барыс...

Аднойчы, якраз у такі час, як цяпер, прыйшлі да Барыса калядоўшчыкі. Ён шчыра ўзнагародзіў іх чым мог, не паскупіўся. У гэтым годзе ўсё ў яго зладзілася добра, ураджай быў вельмі багаты, гаспадарка мацнела.

Калі ж на наступны год вясёлы карагод зноў завітаў на падворак да Барыса, аднекуль наляцела завіруха і панесла калядоўшчыкаў кудысьці. Наслаў яе адзін дрэнны чалавек, які сам нічога не рабіў, а толькі зайздросціў усім, асабліва Барысу — за яго працавітасць. Няўдалымі сталі наступныя гады і для яго, і для ўсіх жыхароў вёскі. Не было чым дзетак і жывёлу ўзімку карміць, ледзьве выжылі.

Вырашыў тады Барыс, што павінен знайсці і вызваліць калядоўшчыкаў ды свята. Але як? Гэтага ён не ведаў. На шчасце, успомнілася паданне, якое чуў у дзяцінстве (яно перадавалася з вуснаў у вусны). Быццам той, хто возьме яйка ад чорнага пеўня і вынасіць у далонях нейкі час, то вылупіцца з яго цмок, які будзе выконваць жаданні. Праўда, была і ўмова: мусіў чалавек любіць цмока, як сваё роднае дзіця, карміць яешняй і не крыўдзіць, бо калі цмок раззлуецца, можа агнём усё спаліць ды хвастом па ветры развеяць.

Баяўся Барыс браць на сабе такую адказнасць, але рабіць няма чаго... Дзеці былі слабыя, жывёла схуднела, жонка плакала, бо не было чаго есці. Пайшоў гаспадар на кірмаш ды купіў чорнага пеўня. Праз некаторы час з'явілася і яйка, падобнае да слімака. З цягам часу з яго вылупіўся цмок. Вельмі ўсе любілі яго. А калі падрос цмок, пачаў заўважаць, што гаспадар яго ўсё працуе і працуе, а на добрае жыццё ну ніяк не заробіць. Сумны ходзіць. Шкада стала цмоку Барыса, вось і спытаў ён:

— Раскажы, гаспадар, чаму сумуеш.

Барыс і падзяліўся сваёй бядою.

Цмок падумаў ды адказвае:

— Не хвалюйся, знойдзем калядоўшчыкаў. Залазь мне на плечы! Хутчэй!

Паляцелі яны высока-высока да вострава на сінім палескім моры. А мора гэтае, дзеці, было вялізнае! Пасярод яго стаяў востраў, а на востраве — цар-



ства. Тут цмок з Барысам і спыніліся, глядзяць яны, а па гэтай зямлі ходзяць, як зачараваныя, калядоўшчыкі. Паклікаў іх гаспадар — не чуюць.

Тады зацягнуў Барыс песню, што на іх старонцы роднай спяваюць:

В сэрэдні двора стояла светёлка,
А в туй світелці штыры оконці:
В першым оконці — то ясный місяц,
В другім оконці — ясное сонцэ,
В трэцюм оконці — ясныя зоркі,
В чэтвортум оконці — райскі пташонькі.
Што ясны місяц — то пан гаспадар,
Ясное сонце — пані господыня,
Ясные зоркі — то іх дэтонькі,
Райскі пташонькі — то іх служонькі.

Пачулі калядоўшчыкі песню, успомнілі край свой родны. Спала з іх зачараванне.

Пасадзіў цмок усіх на спіну ды дадому хутчэй паляцеў. А там ужо снег выпаў, Каляды пачаліся. Узрадаваліся ўсе, заспявалі песню:

Ой на Рожэство, дай на Божэство
Дай ішлы госты дай коляднычкі,
Дай колядныччкі, дай чэлядныччкы.
Ранэнько звоняць, ўсі Богу молять
Ой на Рожэство, дай на Божэство
Яснэ сонэйко взыходыть.





4

– А, што было далей, бабуля?

— Што, што! А вось што... Усе былі ўдзячныя цмоку і Барысу. З таго часу гаспадаркі ў вёсцы пачалі квітнець. Жыхары багацелі.

— Бабуль, а мора тое дзе цяпер? — спытала Волечка.

— Няма яго ўжо, засталася толькі падкоўка з балотаў, над якімі заўсёды плыве туман. На гэтым усё, мае даражэнькія ўнукі. Як у нас кажуць: вось вам казка, а мне — абаранкаў вязка.

— Бабуля, а ці ёсць яшчэ гісторыі пра Барыса? — не суніміліся малыя.

— Шмат іх. Другім разам раскажу, а цяпер ужо позна, трэба спаць.

Бабуля паклала дзяцей у ложкі, паправіла ім коўдры, патушыла святло і пажадала любкам сваім:

Добрай ночы, цудоўнага сна,
Спаць да белега дня.
Прасвеці, прабудзі,
Дай, Божа, здароўечка.

А сама доўга яшчэ ляжала ў сваім ложку ды ўспамінала гісторыі пра Барыса, якія некалі расказваала ёй яе бабуля.

Няма краёў у дзяцінства, калі казкі жывуць у сэрцы народным.

«Благовест» — жемчужина прибужского мужского вокала

Мужской народный вокальный ансамбль «Благовест» — уникален и неповторим, а его концерты всегда проходят с аншлагом и вызывают восторженные отзывы зрителей. Его по праву можно назвать прибужской жемчужиной музыкальной культуры. Накануне профессионального праздника Дня работников культуры мы встретились с его руководителем Евгением Черновым, чтобы выяснить, в чем секрет успеха творческого коллектива.

— Евгений Владимирович, «Благовест» стал одним из первых в советской еще Беларуси музыкальным коллективом, который начал исполнять в концертных залах музыку сугубо мужским составом. Расскажите, как появилась идея создать такой оригинальный ансамбль?

— В 1985 году на базе Чернавчицкой ПМК был образован вокальный ансамбль «Арго». В конце 90-х гг. он распался, и его участники пришли солировать в местный Дом культуры, где в то время я уже работал аккомпаниатором. Подыгрывая на выступлениях этих и других артистов, постепенно сформировалась идея создать собственный вокальный коллектив. В него Светлана Ильина, художественный руководитель ДК, пригласила бывших участников «Арго». Так появился «Благовест». Первым руководителем коллектива стал бывший руководитель «Арго», талантливейший музыкант и аранжировщик Анатолий Розумец. Большое содействие в нашем становлении как коллектива оказал и продолжает оказывать до сих пор директор



ДК Сергей Рабчевский. Он занимается практически всеми вопросами, связанными с организацией концертов, выполняет функции и звукорежиссера на выступлениях. Очень помогает нам на репетициях и в подготовке к концертам и Светлана Ильина. Она наш художественный оформитель, творческий вдохновитель, придумывает сценарии выступлений, формирует концертную программу, помогает выставить номера, украсить сцену... Постепенно начали выступать на местной сцене, затем покоряли и другие. Получив звание народного ансамбля в 2001 г., стали ездить с гастролями и за рубеж.

— За два года с момента образования коллектива вы наработали достаточный опыт, чтобы вам было присвоено звание народного?

— У нас уже была сформирована собственная программа, куда вошли и народные композиции в собственной аранжировке, и популярные эстрадные песни, и акапельные. Это был довольно разноплановый репертуар, ориентированный на разновозрастную аудиторию. Наши концерты состояли из соответствующих блоков, каждый из которых соответствовал интересам определенной группы слушателей. В итоге натакоймикс приходили и 20-летняя молодежь, и зрелые слушатели, и люди «золотого» возраста. Так что к моменту, когда нам предстояло защищаться на звание, коллектив достиг определенного уровня в своей творческой деятельности.

И все-таки мы хорошо осознавали, что нам не хватает профессиональной подготовки. А на защите будут оценивать наше выступление не дилетанты, а довольно серьезные люди, в том числе и из Министерства культуры. Поэтому попросили помочь с подготовкой довольно известного специалиста из Бреста, вокалистку Ларису Свиридович. Она очень серьезно взялась за нас. За неделю до ответственного мероприятия мы спали по три-четыре часа, наши репетиции проходили с восьми вечера до трех ночи. Было довольно тяжело совмещать основную работу с такими интенсивными репетициями. Помню, как наш бывший участник Александр Савчук, трудившийся трактористом в колхозе, слезно умолял руководителя отпустить нас домой — с семи утра ему необходимо было уже быть на работе. Но Лариса Викторовна была неумолима. И за это мы ей очень благодарны. Ее профессиональные советы помогли нам с честью защитить звание народного.

— Тогда же ваш ансамбль получил официальное название «Благовест». Что оно значит?

— Само слово означает один из видов церковного перезвона, который созывает людей на какое-либо торжественное событие, чтобы сообщить благую весть. Наше творчество направлено на радость, теплоту, праздник. И очень надеюсь, нам это удается сделать. После концертов часто подходят наши поклонники, чтобы поблагодарить за ощущение радости, которое мы им дарим нашим исполнением. Кстати, в отличие от многих современных артистов, работаем только с живым звуком.

— Ваш коллектив создавался в противоречивый период — во времена больших надежд и больших тревог. Каким вспоминается то время?

— Первое десятилетие мы искали себя. Старательно «лепили» свое собственное видение на творчество. И хотя этот период был непростым — менялся состав, менялся репертуар, но каждый выкладывался сполна. И со временем нам это окупилось. У нас появились свои поклонники, своя аудитория, оригинальный репертуар, мастерство исполнения. Уже без ложной скромности можно отметить красивые, сочные голоса и выразительность пения наших участников. Каждый опус получается по-театральному ярким, со своим характером — можно сказать, отличительные черты нашего творческого почерка.

— Какую музыку вы открыли для слушателей впервые? Какие репертуарные находки стали наиболее волнующими для вас?

— Репертуар ансамбля интересен и разнообразен: песни прошлых лет, мировые хиты, эстрадные композиции, известные классические произведения, песни кино и военных лет. В год у нас появляется 4-6 новых музыкальных произведений. Если говорить о наиболее популярных, то, конечно, это песня «Поднимем чарку за Беларусь!», которая является неизменным хитом всех выступлений. Ее написал талантливый украинский самородок Роман Задорожный, который является автором и многих других замечательных песен ансамбля: «Малая родина», «Дожинки», «Весна».

— Знаю, что идейным вдохновителем в ансамбле являетесь вы сами. Как рождаются композиции?

— Если мне понравилась какая-то песня, я могу несколько дней прокручивать ее в голове, «пробуя на вкус». Когда сформировывается собственное видение музыкального оформления, на репетициях уже вместе со всеми участниками коллектива пробуем исполнить композицию. Когда-то на заре становления ансамбля большой поклонник нашего творчества Иван Бурда (директор ОАО «Чернавчицы» оказывает ансамблю большую спонсорскую поддержку, помогает с приобретением музыкальной аппаратуры, сценических костюмов. — Прим. авт.) подарил нам синтезатор Yamaha. Мне, как человеку, профессионально освоившему этот музыкальный инструмент, просто необходимо было оправдать столь ценный подарок. Пришлось соответствовать (смеется). И до сих пор именно на нем создается много переложений, обработок, из незатейливых произведений появляются настоящие хоровые шедевры с объемной фактурой, с интересными драматургическими задачами. Так что можно сказать, что «Благовест» заставил меня быть композитором.

На самом деле, создание нового произведения, даже его обработки, не совсем так просто. Надо превосходно чувствовать хоровую фактуру, возможности, вокальные данные каждого участника, общую стилистику. Поэтому конечный продукт — это совместное творчество всего коллектива.

— Расскажите об остальных участниках коллектива. Кто они — уникальные теноры Прибужья?

— В первую очередь, по-настоящему трудолюбивые и одаренные люди. Благодаря их таланту, терпению, неиссякаемой энергии, желанию совершенствоваться, самоотдаче ансамбль сегодня стал таким, каким его знают наши поклонники. В его составе, помимо меня, четыре солиста: Роман Задорожный, Анатолий Дядюк, Иван Стрельчук и Станислав Косюк. Кстати, наши «ветераны» — самые активные, веселые и задорные члены коллектива. Ни одна репетиция не обходится без их шуток. Иван Николаевич является не только талантливым вокалистом. Как профессиональный строитель-отделочник, очень много сил и умений вложил в реставрацию церкви Параскевы Пятницы в Чернавчицах, его работу можно заметить и в школе, и на сель-

хозпредприятии. Недавно он отметил свой 60-летний юбилей. Самый молодой и не менее талантливый участник ансамбля — аккомпаниатор Анатолий Анатольевич, ему всего 36 лет.

— Сегодня «Благовест» является лауреатом многих областных, республиканских конкурсов, ему рукоплещут во Франции и Польше, Украине и России... Как в целом вы можете охарактеризовать свое творчество?

— Мы стараемся делать упор на создание современной обработки народного творчества. Для нас эта цель не в собственном пиаре, а в возможности заинтересовать современным звучанием фольклора молодежь. Поэтому произведения отличает бережное отношение к первоисточнику. А насколько оно качественно и профессионально исполнено, уже судят наши зрители. И их любовь и признание — для нас самая ценная награда.

Наталья ТОЛКАЧЕВА
Фото Павла БОГУША

В гостях у пана Спарышки

Юрий Сальников и Александра Дубина — по профессии психологи. Долгое время они работали по специальности, но однажды решили изменить свою жизнь. Сейчас они ремесленники, хозяева варштата «Пан Спарышка», занимаются возрождением ткачества. А термнн «варштат», означает «верстак», «ткацкий станок»... Сегодня Юрий и Александра — гости «АР».



Брестские ремесленники Юрий Сальников и Александра Дубина





— **Как получилось, что вы сменили сферу деятельности?**

Юрий: Нашей культурой увлекаюсь ещё со школьных времён. В старших классах даже вёл дневник по-белорусски. Ремёслами заниматься начал лет пять назад. Совмещать ткачество с работой было сложно. Хотелось расширить мастерство и глубже погрузиться в народную культуру, поэтому ушёл из БрГУ, где преподавал долгое время. От психологии остались, наверное, встречи, в которых я больше как модератор. Летом организовали для семейных пар клуб «Мелки для тараканов». Правда, проект перестал существовать, сейчас наши встречи называются «Плюшевый Велес».

Александра: Прошла всё, начиная от детского сада и заканчивая университетом имени Пушкина. Однако поняла, что хочется свободного графика: самой отвечать за своё время, зависеть только от себя и продолжить любимое дело.

— **Что подтолкнуло заняться ткачеством?**

Юрий: Саша давно занималась вышивкой, но в какой-то момент узнала, что есть ткачество на бердечке, и упросила меня сделать инструмент. Нашёл чертежи, сделал два. Самому стало интересно узнать, как это работает. Ткачество — это всё-таки инженерное ремесло, чётко просчитываемое, много нужно чертежей, много в нём нюансов, схем орнамента. Затем и я увлекся: сделал себе пояс, кому-то — в подарок. Попробовал работать с тонкой ниткой — сделал первый браслет и решил продолжить.

Александра: Люди интересуются стилистикой белорусской культуры, особенно гости, хотят увезти кусочек нашей культуры. Мы переносим традицию и самобытность в современный контекст. Делаем браслеты, кулоны, подвески, которые можно носить с любой одеждой.



— **Раньше орнамент наделяли особым смыслом. Придерживаетесь ли вы этого?**

Юрий: Скорее следуем тому, что любой узор по-своему хорош: предки вряд ли наполняли своё пространство плохими символами. В основном заимствуем узоры из книги Веры Селивончик «Белорусские народные пояса». С цветами же экспериментируем по принципу «разложишь и смотришь, что подходит».

— **Сколько времени уходит на изготовление, например, пояса?**

Юрий: Зависит от количества нитей. Заправка — дело особенное, может занять от нескольких часов до целого дня. Самый широкий пояс, который я делал, был на девяносто девять нитей. В ткачестве важно соблюдать технологию, и, если что-то упустишь, сразу нарушается канва. Больше четырёх часов в день работать не могу. Если пояса средней сложности, можно сделать 40–50 сантиметров в час. Стандартный мужской пояс — три метра, на его изготовление уходит до шести часов, и это только ткачества, не считая других работ.

— **Вы нередко участвуете в фестивалях...**

Юрий: Ездим почти по всей Беларуси. Фестивали — это плюс для ремесленников, встречаешь разных людей, вдохновляешься новыми идеями. Живой обмен опытом — рост любого мастера. Например, я научился, как спрятать нитку в ткань, чтобы не было узелка. После этого появилась возможность сделать магниты.

— **Мастер-классы проводите?**

Александра: Мы начали воплощать такую идею. Стараемся проводить их в психологическом ключе, и называем «Нитки, которые связывают семью». Запустили плетение шнуров, как круглые и квадратные пояса, делаем браслеты, кулоны, различные брелоки. Детям нравится, потому что они сразу могут их сделать сами.

— **Варштат «Пан Спарышка» — это что?**

Юрий: Варштат — многозначное старобелорусское слово, значение его — «мастерская». Варштатом называли первые ткацкие станки, верстак. Решили, что так будет интересней, чем мастерская. «Спарыш» в нашей культуре символ плодородия и достатка. Например, когда находили сросшиеся зерна, то их называли спарышами. Так же назывался горшочек из двух частей, скреплённых одной ручкой. В нём носили в поле обед — первое-второе, а сверху буханка хлеба. В энциклопедии белорусской мифологии слово «спарышка» – дух, который вдохновляет человека на работу, дает второе дыхание.

— **Есть ли в планах разнообразить изделия в национальном колорите?**

Юрий: В планах аксессуары для дома, салфетки, скатерти, вязаные магнитики. Всё то, что можно использовать в быту, но чтобы это было интересно и с уклоном в традицию.

Александра: Думаем представить релакс-серию: льняные подушечки, внутри которых будут косточки вишни. Их можно разогреть в микроволновке, и тогда это будет грелка с приятным ароматом, и детям подойдёт для развития моторики.

– Успехов вам в вашем деле!

Наталья ШЛЯЖКО
Фото из семейного архива Юрия и Александры

Цирк — это праздник, радость, эмоции

Если ваши дети полны энергии, любят кувыркаться и стоять на голове, мечтают выступать, поражая своей гибкостью, ловкостью и силой… вас ждут в образцовой цирковой студии «Иллюзия» в агрогородке Чернавчицы.

Целью работы студии является приобщение детей к ценностям культуры посредством занятий цирковым искусством.

В процессе обучения ребята осваивают такие цирковые жанры, как акробатика, жонглирование, эквилибристика, пластика, хула-хупы, клоунада и т.д. Многообразие жанров позволяет раскрыть индивидуальные творческие способности каждого ребенка.

Достигшие достаточной степени физической формы учащиеся студии приступают к овладению различными видами жанров. В последующем студийцы проходят подготовку концертных номеров. Дети совместно с руководителем обдумывают тематику номера, образ, костюмы и репетируют. Уже через некоторое время юные артисты уверенно выступают с яркими, запоминающимися сольными и групповыми цирковыми номерами, в праздничных представлениях и конкурсах детских цирковых коллективов.

Разнообразие жанров, яркие костюмы, оригинальные номера поражают зрителей и являются украшением различных праздничных мероприятий нашего района. Воспитанники студии являются лауреатами республиканских конкурсов, обладателями дипломов конкурсов циркового искусства, участниками и победителями районных, городских, областных и международных фестивалей.

Этот год не был исключением для цирковой студии, и стал особенно результативным и показательным. Так, в марте этого года артистки образцовой цирковой студии с номером «Марионетки» были удостоены лауреата II степени на Международном многожанровом фестивале-конкурсе творчества «Millennium», который проходил в Бресте. За личный вклад в культурное,



Образцовая цирковая студия “Иллюзия”

нравственное и эстетическое воспитание подрастающего поколения выражена благодарность руководителю студии Капустюк Светлане Сергеевне. Это талантливый мастер и педагог, который всю свою любовь к цирковому искусству и мастерство передаёт подрастающему поколению.

В городе Минске в апреле месяцеэтого года прошёл Международный детский конкурс «Карнавал эмоций». В номинации оригинальный жанр - номер «Белорусочка» в исполнении Капустюк Марии был оценен жюри дипломом I степени, а трио «Вдохновение» - дипломом I степени (Буткевич Алина, Тричук Софья, Барановская Александра), номер с обручами «Танцуй со мной» Капустюк Маргариты и дуэт-пластика «Шёпот звёзд» (Шанта Виктория и Васильчук Полина) – завоевали дипломы 2 степени. Все артисты студии уехали из Минска с кубками, медалями и дипломами.

29 июня при поддержке Брестского городского и областного объединений профсоюзов прошёл первый открытый фестиваль любительского художественного творчества «Берасцея запрашае». На этом фестивале были отмечены медалями и грамотами номера «Белорусочка» и пластический этюд «Танго» Шанта Виктории, а номер эквилибр на тростях «Песня моря» в исполнении Тричук Софьи прошел в финал конкурса и после выступления на гала-концерте стал лауреатом 3 степени. В конкурсе участвовало много достойный коллективов, а также 4 цирковые студии из Кобрина и Бреста. Благодарственным письмом отмечена руководитель за большой вклад в развитие творческого потенциала и помощь в сохранении культурного наследия страны.

28 сентября состоялся областной фестиваль-конкурс «Эстрадный MIX». Мощук Анастасия с номером эквилибр «Грация» заняла I место в своей номинации. Капустюк Мария с номером «Белорусочка» была оценена дипломом II степени в оригинальном жанре в своей возрастной категории. За популяризацию современного искусства, исполнительское мастерство студия также была награждена дипломом.

